БІБЛІЯТЭКА САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

БИБЛИОТЕКА СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ БЕЛАРУСИ

Казімір КАМЕЙША

# ГОРДЗІЕЎ ВУЗЕЛ

ВЕРШЫ І ПАЭМА,
ЛІРЫЧНЫЯ МІНІЯЦЮРЫ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2016

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
К18

**Камейша, К. В.**
К18 Гордзіеў вузел: вершы і паэма, лірычныя мініяцюры / Казімір Камейша. — Мінск: Чатыры чвэрці, 2016. — 292 с. — (Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі).

ISBN 978-985-7058-95-2.

У цэнтры новай кнігі Казіміра Камейшы «Гордзіеў вузел» — чалавек, які стаіць перад тварам жыцця, востра адчувае час, жыве яго трывогамі, радасцямі і бедамі, а яшчэ задумваецца над яго хуткацечнасцю. Шмат цёплых і шчырых радкоў прысвяціў паэт роднай Налібоцкай пушчы, яе непаўторным краявідам і людзям свайго краю. Паэма «Няміга» звернута да гісторыі нашай Бацькаўшчыны. Завяршаюць змест кнігі лірычныя мініяцюры «Паміж кубкам і вуснамі».

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-7058-95-2**

© Камейша К. В., 2016
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2016

## ПУШЧАНСКАЯ МАЛІТВА

Пушчаў нашых і дуброў прамаці!
Ты, зямная, на зямлі адна.
Тое, што ад Бога, — ёсць багацце.
Ты ад Бога дадзеная нам.

Толькі кінеш позіркам здзіўлёным —
І вачам дабавіцца святла.
Гэта ж ты зялёнаю каронай
Кроны так галініста спляла.

Ты ўстаеш зялёнаю мярэжай
І бярэш дубы свае ў браню.
Белая ў цябе з аблокаў вежа,
А сама — з зялёнага агню.

Ты спакою зноў дала галінам,
Астудзіла пыл знішчальных піл.
І магутны твой абрыс зубрыны
Паўтарае сонцам небасхіл.

А калі ўздымалася навала
І сякера секла ў дзве рукі,
Браму нетраў шчыльна замыкала
Ты на ўсе пушчанскія замкі.

А сяброў лагоднаю усмешкай
Сустракала шчыра, як братоў.
Аж да сэрца сонцам слала сцежкі
І гасцінна ўсаджвала за стол.

Ты заходзь у сэрца проста,
прама,
Бо яно не мае берагоў.
Сэрца беларускае — не брама,
Насцежы шырокія ў яго.

Белая!..
Шуміш ты, як шумела.
Дуб стаіць магутна, як стаяў.
Ды шчыміць ля сэрца, як шчымела,
Памяць незагойная мая.

Звер твой не з пароды ваяўнічай,
Але помніш здзек далёкі ты.
Зграі каралеўскай паляўнічай
Порах яшчэ ў кронах не астыў.

Што ж, без каралеўскае уцехі
І кароль часамі варты смеху.
Што ж, без паляўнічага трафею
І кароль бывае, што звярэе.

З памяці дыхне часамі ветрам,
Порахам гарэлым,
смаляком.
І крывавы хрып у горле вепра
Мёртвым запячэцца камяком.

Пальне проста з памяці трывожнай
Стрэл
і атрасе з галін зіму.
І ўздрыгне на тушы бот вяльможны.
Не шкадуйце вечнасці яму!

Валачэ фатограф зноў трыногу
І муштруе ўпарта аб’ектыў.
І дарогі ўсе ў адну дарогу
Цягнуцца самотна праз кусты.

Вось і ўсё. І спынена хвіліна.
Зараз світа выгукне: «У-р-р-а!»
Выйшаў ён з нявыйсця, цар зубрыны.
Эх, за што ж апошняга цара?!.

Стогнуць зноў дубы,
гамоняць хвоі,
Цягне дзесь сваю разору дзік.
Выкінь, Час, з кішэні ўсе набоі
І арэхаў жменю пакладзі!

І прыкленч над спелаю суніцай,
І мятлушкі водару ўдыхні.
Хай табе харошы сон прысніцца,
Як ты цуд вось гэты бараніў.

Пушчаў і бароў маіх прамаці,
Ты расслаб карэнні хоць цяпер!
Не хачу я знаць ніякай знаці,
Я малюся толькі на цябе!

Гаснуць каралеўскія кароны,
Сумна адцвітаюць іх агні.
Ну а ты шуміш сваёй зялёнай
І гайдаеш ціха нашы дні.

Б'юцца сэрцу ў такт твае крыніцы,
І смалою гояцца рубцы.
І высока вежа камяніцца
Праз свае каменныя вянцы.

Родная і светлая, як свята,
Ты нібы з каленяў прыўстаеш,
Клічаш у шатроў вятрыстых шаты,
У абдымкі вечныя свае.

Малады блакіт на крылах весніх
Так святочна промні залацяць.
Ты і ёсць пачатак нашай песні,
І сама — святы яе працяг!

## ДАРОГА

Ад Беларусі да Літвы дарога —
Нібы прамень з вачэй самога Бога.

Шліфуючы асфальт і самі вёрсты,
Калышучы ўспамінаў нашых вёсны,
Цераз масты, узгоркі і прыпынкі
Ляціць яна то лёгкай аблачынкай,
То павучынкай бабінага лета,
То думкай лёгкакрылаю паэта.

Яе шчасліва недзе ля Смаргоні
Лісток літоўскай восені дагоніць.
Ляціць праз час яна, дзе ў сінім дыме
Спяваюць вёскі назвамі сваімі,
Цвітуць сады, зязюляй бор кукуе,
Дзе сцежкі, як і людзі, сваякуюць.

Жыве, шуміць, спяваючы, вяснуе,
Любоў сваю спрадвечную шануе
Вялікае бароў і пушчаў княства,
Дзе песняю адной з'яднана птаства;
Дзе Нёман праз абшары Налібокаў
Да мора коціць хвалі і аблокі
З крыніцамі ўпрыпрэжку, з раўчукамі
І Вілію здалёк яшчэ гукае;
Дзе берагі ўстаюць, як сцены замкаў,
І ластаўкі крыляюць проста ў заўтра;
Дзе плынь бяжыць і час апераджае,
На межы і таможні не зважае.
Няма нідзе і ў сэрцах нашых межаў,
Бо не бывае ў дружбы зарубежжа.

Бягуць узлескі, сцелюцца нізіны,
Рубінавым агнём гарацць рабіны.
Як позірк, фарба фарбу перахопіць.
Вось момант, што мастак не кожны схопіць.

Кладуцца фарбы вёснамі да вёснаў —
Які пейзаж знаёмы і дзівосны!..

...Як ясны водбліск промня залатога —
Ад Мінска і да Вільнюса дарога.
Ну вось ён, горад — Памяці калыска,
Дзе свой пачатак ты шукаў калісьці.
Абрыс гары сівой ястрабавокі
І галубоў пагодныя аблокі
Ганяе звон грымотны кафедральны
У веснавой празрыстасці світальнай.

Ты ўмееш і сустрэць, і прыўсміхнуцца,
І з вечнасцю самой перамігнуцца,
І готыкай здзівіць спічастых храмаў,
І ўважыць вострым зіркам Вострай Брамы.
Твае муры ў паставе задумённай
І даты праспяваюць, і імёны.
У цэгле іх барвянай, нібы восень,
Арганна столькі гукаў разлілося.
Па гэтых вулках, плачучы радкамі,
І песня наша родная блукала.
Яна часамі прамільгне і сёння
У світцы саматканай Кастусёвай.
Аззяны шклом найшоўшыя кварталы —
Саюз вясны, блакіту і металу.
Ты ўвесь ляціш, і след твайго палёту
Адбіты ясна ў позірку пілота.
Калі агнямі грае тэлевышка —
Само віно букеціцца ў кілішку.

Літва!
Ты ўся з блакіту і бурштыну,
З вясёлага чыйгосьці прыпаміну.
Ты ўся з вясны, ты светлая такая
Ад Куршскіх дзюн і да азёр Тракая.
Даўно карэнні нашы, як і Памяць,
Аднымі моцна звязаны вузламі.

Адзіным плугам мы аралі поле,
Адзіным мечам нас хрысціла доля!
Зубр белавежскі з панявежскім разам
Адной трубою зноўку будзяць ранак.
На хвалю хваля лёгка набягае,
І сэрца новай песні вымагае.
А ў песню тчэцца ўсё адным узорам:
Лугі, азёры, рэкі, вочы, зоры.
А над усім — лясоў сівых аблога…
Ёсць на зямлі такая вось дарога!..

## МОЙ САД

Ляці нязмушана ў мой сад
Здалёку, птушка.
І весялі вачэй пагляд,
Галінку гушкай.

З усіх ён самы найзямны,
Мой сад не райскі.
У каранёў — спакой лясны,
Сум хутаранскі.

З прышчэпаў ён,
Шуміць, як бор,
Як гнеў народны.
Ён кроны густа распасцёр
Пад небам родным.

Я сам на дзічцы прышчапіў
Той дубчык роўны.
Хто сок яго аднойчы піў,
Той сам бунтоўны.

Спляліся повяззю адной
Карэнні нашы.
Мой смутак з радасцю яго
Прышчэплен нават.



**КАМЕЙША**
**Казімір Вікенцьевіч —**
**паэт, перакладчык.**

Нарадзіўся 4 снежня 1943 года ў вёсцы Малыя Навікі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыў філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Служыў у Савецкай Арміі. Працаваў у раённых газетах Міншчыны — у Капылі, Стоўбцах, Дзяржынску, Валожыне, у сталічнай шматтыражцы «Аўтазаводзец»; на Беларускім радыё. Значную частку літаратурна-мастацкага даробку склала праца ў часопісах «Вясёлка», «Маладосць», «Полымя», «Вожык».

Упершыню з вершамі ў рэспубліканскім друку выступіў у 1961 годзе. Аўтар зборнікаў паэзіі «Восеньскія позвы», «Мембрана», «Нектар», «Тут мае вёсны прычалены», «Сябрына», «Плёс», «Галоўная вярста», «Пярэймы дня», «Кубак блакіту» і інш. Выдаў кнігі прозы «Духмянае дзіва» і «Паміж кубкам і вуснамі». Дзіцячыя творы К. Камейшы ўвайшлі ў кнігі «Гаёўка», «Буслянка», «Дзятлава кузня», «Гарцунок», «Крыгагром». Перакладаў творы рускіх, украінскіх, славацкіх і польскіх пісьменнікаў на беларускую мову.

Творчая праца Казіміра Камейшы адзначана літаратурнай прэміяй Аркадзя Куляшова (1989) і прэміяй Залаты купідон (2011).

## ЗМЕСТ

Пушчанская малітва . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Дарога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Мой сад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Чорны бусел . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
А ў свеце... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Востраў адзіноты . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Дудка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
«Пазалетняе...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
«Ён пойдзе і жарт свой пакіне...» . . . . . . . . 16
«Пасецца туман на аселіцы...» . . . . . . . . . 17
Прыпамін на старым ганку . . . . . . . . . . . . 18
«Я доўга цяпельца не мог распаліць...» . . . . . . . . . . . 19
«Закараніўся падлесак...» . . . . . . . . . . . . 20
«Ізноў дабро падпільнавана злом...» . . . . . . 20
Дым . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
Курапаты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Хутар Грань . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Пра рэчы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
Саракі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Дом у клянах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
«Здалёку, з часіны забытай...» . . . . . . . . . 30
Блуканне ўначы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Рыбалоўнае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Размова з зямлёй . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Прымірэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35

Ukralі плуг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Памяці Апалінара Пупко,
слыннага івянецкага майстра,
і тры яго прыпаміны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
«Былі памылкі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
«Смешна-задаволеныя хлопчыкі...» . . . . . . . . . . . . 40
«У той хутаранскае хаце...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
«На хітры сябраў інтарэс...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Восеньскі паром . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Ліквідатар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
«У ніці, што прала вясна...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
«Маё. Хоць і далёкае...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
«Здалёку прыехаў...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
«Чаго спяшацца...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
«На неба гляджу з-пад рукі...» . . . . . . . . . . . . . . . 48
«Старэе бацькоўская хата...» . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Навука . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Пра скарбы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
Страта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Стадыён . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
«На сцежцы ранішняга зману...» . . . . . . . . . . . . . . 54
Старая скрыпка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Бярозавая настальгія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Седы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Незнаёмы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Пра кішэні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
«Мне прывітанне неяк з Польшчы...» . . . . . . . . . . 62
Адарваны ад зямлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
«Найбагатая пара...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Жніўны прыпамін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
«Ці той амшар...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
«Лясное паўсонне адталай зямлі...» . . . . . . . . . . . 65
«Пад цёплай згняздованай кронаю...» . . . . . . . . . 66
«Пакіну гэты шалёны горад...» . . . . . . . . . . . . . . . 67
«Рэхам з касцёла Роха...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68

Зацьменне сонца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Канакрад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Брама . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Падарожжа ў дзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
«Давайце яшчэ раз пракруцім...» . . . . . . . . . . 75
Рама да незавершанай карціны . . . . . . . . . . . . 76
Паэт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Папарацы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Птушка яе вясны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Страх . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
«І адкуль яно хлынула толькі...» . . . . . . . . . . 82
«Завіруха...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
«Сеялася дзіўнае сяйво...» . . . . . . . . . . . . . . 83
«Ходзіць, блукае вачыма...» . . . . . . . . . . . . . 84
Рыбацкія сны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
«Была зіма...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
«З арыфметыкай у згодзе...» . . . . . . . . . . . . . 86
Яна пайшла… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
«Маёвым млеўным, цёплым ранкам...» . . . . . 88
Птушка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89
«Пачакай, не йдзі далёка...» . . . . . . . . . . . . . 89
«Шчабятуха-ластаўка...» . . . . . . . . . . . . . . . . 90
«Было нядаўна гэта ці даўно...» . . . . . . . . . . 91
Зося . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
«Яшчэ не запрэжаны коні...» . . . . . . . . . . . . 93
Завея . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Л.Ф.В. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
Стометроўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
Ода жаночым грудзям . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Кавалер . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
«Я ў пушчы неяк выгукнуў...» . . . . . . . . . . . 101
Рай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Няміга (*Паэма)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Трывожнае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122
Акно . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123

«У жніўня вусы жоўтыя...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
На вучэннях па грамадзянскай абароне . . . . . . . . . 125
Швэдар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126
Высокі бераг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Лясное возера . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
«Зноў дахі ў туман заплылі...» . . . . . . . . . . . . . . . 129
Вір . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Астравы на сушы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Нeманіна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
«А паміж памяццю і снамі...» . . . . . . . . . . . . . . . . 133
«Жыццё, заміраеш само ты...» . . . . . . . . . . . . . . . 134
Прыгадка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
Ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Майму настаўніку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
«Хоць як быццам усё не чужое...» . . . . . . . . . . . . 137
«І запаліць вясна...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
«Ля вясковае каплічкі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
Веснавое . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
«Прырастае новы дзень...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
Праз мост, раку і памяць… . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
«Ах, як зноў балюча рупіць» . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
З перажытага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
Мроя Белай вежы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
«На гармоніку разораў...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
Мой гадзіннік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
Карані . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
Сто першая вярста . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
Свята вёскі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
«Малюе ножкай нейкі ўзор...» . . . . . . . . . . . . . . . 150
Ручаёк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
«А ўсё ж ты была...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 151
Хутар Няшота . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 152
Боль вясны маёй . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154
Шлях, які не пройдзеш двойчы . . . . . . . . . . . . . . 155
Восеньскае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 156

Нізок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157
«На новы лад перавяла...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 157
«Сцежкамі аж на край свету...» . . . . . . . . . . . . 158
«Адвязі мяне ў лета!» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
Бацькава каса́ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
«Я па гэтых вуліцах хадзіў...» . . . . . . . . . . . . . 161
Веснавое акно . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 163
«Плыве мая позняя лодка...» . . . . . . . . . . . . . . 164
Жарабок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165
«Як іду на споведзь я да Бога...» . . . . . . . . . . 166
«Прывязалі да калодзежа...» . . . . . . . . . . . . . . 166
«Падрасла мая бяроза...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
«Лясная вёсачка-памежніца...» . . . . . . . . . . . . 168
Кароль . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 168
«Сёння ўсё ад сонца слепне...» . . . . . . . . . . . . 169
Пакаянне ўрагана . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 170
Маё зарубежжа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 171
Музей старых рэчаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
Пушчанская раніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 173
«Ужо не слухаюцца нас...» . . . . . . . . . . . . . . . 174
Кругазварот . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 174
Бярозы ў Мікольцах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 175
Загадка травы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 176
«Вось жа зноў сваё заладзіў дзяцел...» . . . . . . 176
Белы сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177
Салаўіная ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
«Цераз хвайняк да Хатавы...» . . . . . . . . . . . . . 179
Родны бераг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 180
«Ля возера зноў прыпамін мой свежы...» . . . . . . 181
«Сем вёрст марудных тупаў ад шашы...» . . . . . . 182
«Мой бор пашуміць, і суцішыцца...» . . . . . . . . 183
«І прысніў, і паверыў...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 184
«Басанож па расе...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 185
Старыя ходзікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186
«Смуткам восеньскіх дзён...» . . . . . . . . . . . . . 187

Раніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
Начны эцюд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
Звеставанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
«За ракою Перакуль...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 190
Знаходка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 191
Акардэон Хведара Чэрні . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
«Дзе граб абдымаўся з ялінай...» . . . . . . . . . . . . . 193
«Вечназялёніцца ойчы наш край...» . . . . . . . . . . . 194
Госць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 194
Нябесны замак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
Рака . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197
«Бераг там, якіх на свеце мала...» . . . . . . . . . . . . 198
«Няма на цяпло аніякіх прыкмет...» . . . . . . . . . . . 199

Паміж кубкам і вуснамі *(Лірычныя мініяцюры)* . . . . 200

Пра аўтара. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 285